# ЦЭНТРАЛІЗАВАНАЯ СІСТЭМА ДЗЯРЖАЎНЫХ ПУБЛІЧНЫХ БІБЛІЯТЭК Г. МІНСКА

**сектар інфармацыйна-бібліяграфічнай работы**

## Нацыянальная літаратурная прэмія Беларусі за 2023 год

Нацыянальная літаратурная прэмія Рэспублікі Беларусь – штогадовая прэмія, якая прысуджаецца з 2015 года. Праект накіраваны на падтрымку развіцця айчыннай мастацкай літаратуры для дарослых, дзяцей і юнацкасці, розных жанраў пісьменніцкай творчасці: паэзіі, прозы, драматургіі, публіцыстыкі, літаратурнай крытыкі і літаратуразнаўства, а таксама на папулярызацыю кніг і чытання, за ўклад у літаратуру Беларусі. Заснавальнікамі прэміі з'яўляюцца Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і Саюз пісьменнікаў Беларусі.

Узнагароджанне пераможцаў конкурсу праводзіцца ва ўрачыстай абстаноўцы ў час святкавання Дня беларускага пісьменства. Лаўрэаты Нацыянальнай літаратурнай прэміі за 2023 год былі ўшанаваны сёлета ў Гарадку. Кнігі-лаўрэаты знаходзяцца ў фондах установы «Цэнтралізаваная сістэма дзяржаўных публічных бібліятэк г. Мінска».

Спіс бібліятэк ўстановы:
Ф1 — № 1, імя Талстога, вул. Маскоўская, 18
Ф2 — № 2, імя Крупскай, вул. Усходняя, 56
Ф3 — № 3, імя Маякоўскага, вул. Сяліцкага, 103
Ф4 — № 4, імя Гогаля, вул. Лабанка, 22
Ф5 — № 5, вул. Казлова, 2
Ф6 — № 6, вул. Кашавога, 10
Ф7 — № 7, імя Коласа, вул. Пляханава, 97, к. 4
Ф8 — № 8, імя Багдановіча, вул. Даўгабродская, 12/2
Ф9 — № 9, вул. Лібкнехта, 51
Ф10 — № 10, імя Мінковіча, б. Шаўчэнкі, 15
Ф11 — № 11, праезд Ташкенцкі, 3
Ф12 — № 12, вул. Аўрораўская, 8
Ф13Ц — № 13, вул. Народная, 43а
Ф14 — № 14, імя Багушэвіча, вул. Прытыцкага, 42
Ф15 — № 15, імя Цёткі, вул. Талбухіна, 12а
Ф16 — № 16, пр. Ракасоўскага, 50
Ф17 — № 17, Лагойскі тракт, 25
Ф18 — № 18, вул. Каліноўскага, 55
Ф19 — № 19, вул. Казінца, 122

Ф20 — № 20, вул. Жукоўскага, 9, к. 1
Ф21 — № 21, вул. Слабадская, 63
Ф22 — № 22, вул. Чачота, 23
НМ — Нотна-музычная бібліятэка, пр. Партызанскі, 3
СГБС — Спецыяльная гарадская бібліятэка для сляпых, вул. Камуністычная, 42
ЧЗ — чытальная зала ЦБ імя Янкі Купалы, вул. В. Харужай, 16
АБ — абанемент ЦБ імя Янкі Купалы, вул. В. Харужай, 16

## Імянны паказальнік:


**Шах Соф'я**

**Гаўрыловіч Уладзімір**

**Стэльмах Алена**

**Прыходзька Алеся**

**Сабуць Аліна**

**Макараў Уладзімір**

# Намінацыя
# «Лепшы твор (зборнік твораў) паэзіі» —
# Соф’я Шах
# за кнігу
# «Дыядэмная споведзь»






**Шах, С. М. Дыядэмная споведзь** : вянок вянкоў вянкоў санетаў / Соф'я Шах ; [прадмовы: А. А. Каваленя, І. Катляроў]. — Мінск : Беларуская навука, 2022. — 639, [2] с.

**ЧЗ, Ф7, Ф14.**

Выдавецтва «Беларуская навука» прапануе ўсім прыхільнікам прыгожага пісьменства першую не толькі ў нас, але і ва ўсёй славянскай паэзіі санетную дыядэму. Пачынаецца і заканчваецца твор словамі: «Жылі калісьці продкі на зямлі…» Соф’я Шах невыпадкова назвала яго «Дыядэмнай споведдзю». Спавядальнасць — галоўная асаблівасць, дзякуючы якой, як сказана ў прадмове Ізяслава Катлярова, «стагоддзі зьліжаюцца і аддаляюцца... Толькі так асабістае перастае быць уласным і набывае

мастацкае абагуленае ўвасабленне. Жанравая неабходнасць паўтарэння радкоў надае не толькі рытмамузыку, але і робіцца сэнсавым катонам...». Мастацкае афармленне выканана на аснове твораў жывапісу С. М. Шах. Кніга зацікавіць усіх, хто духоўна адчувае сваю лучнасць з паэтычным багаццем роднага беларускага слова.

## Намінацыя «Лепшы твор прозы» — Гаўрыловіч Уладзімір Мікалаевіч за кнігу «Па веры вашай…»






**Гаўрыловіч, У. М. Па веры вашай...** : раман-версія / Уладзімір Гаўрыловіч. — Мінск : Звязда, 2022. — 318, [1] с.

**Аб., Ф1, Ф3, Ф4, Ф5, Ф6, Ф7, Ф10, Ф11, Ф12, Ф13Ц, Ф14, Ф15, Ф17, Ф19, Ф20, Ф22**

Памяць канчаткова не сціраецца нават праз вякі, сцвярджае вядомы беларускі пісьменнік Уладзімір Гаўрыловіч у гісторыка-пазнавальным, сацыяльна-праблематычным рамане-версіі "Па веры вашай...". Несучы па жыцці свой духоўны крыж, усе героі мастацкага твора праходзяць цяжкі шлях да ачышчэння. Яны абараняюць веру сваю, род і сям'ю, гістарычную памяць сваёй шматпакутнай зямлі, прызываюць усіх нас, беларусаў, не захлынуцца ў

дыме матэрыяльных выгод, уяўнага дабрабыту, хцівага "клопату" чужынцаў пра нас. Твор, падзеі ў якім адбываюцца ў нашы дні, у 2020 і 2021 гадах, а таксама дзесяць стагоддзяў таму ў старажытных Тураве, Кіеве і Кракаве, заклікае чытача шанаваць мінулае, каб зразумець сапраўднае, каб клапаціцца пра сваю будучыню і будучыню свайго народа, Айчыны– Беларусі.

## Намінацыя
## «Лепшы твор для дзяцей і юнацтва» —
## Стэльмах Алена
## за кнігу
## «Пашка і сонечны праменьчык»







**Стэльмах, А. А. Пашка і сонечны праменьчык** : казкі : [для малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту] / Алена Стэльмах ; [мастак Л. Жванія]. — Мінск : Звязда, 2022. — 101, [2] с.

У новай кнізе вядомай пісьменніцы Алены Стэльмах сабраныя казкі разнастайнай тэматыкі: на аснове рэалій сучаснага жыцця, фальклорных матываў, паводле гістарычнага мінулага Айчыны. Але ўсе творы яднае адметны творчы стыль аўтара, што

абапіраецца на светапогляд беларусаў, на нацыянальныя каштоўнасці нашага народа.

**ЦБ АБ, Ф2, Ф3, Ф5, Ф7, Ф8, Ф11, Ф13, Ф13Ц, Ф14, Ф15, Ф17, Ф20, Ф22**

## Намінацыя «Лепшы дэбют» —
## Алеся Прыходзька
## за кнігу «Хлюпик и друг его Нюня»






**Приходько, А. Хлюпик и его друг Нюня** : истории из жизни двух друзей : [для дошкольного и младшего школьного возраста] / Алеся Приходько ; [художник М. Василек]. — Минск : Мастацкая літаратура, 2022. — 45, [1] с.

"Хлюпик и друг его Нюня" – гэта серыя апавяданняў аб двух лепшых сябрах. Яны вараць кісель з цыбуліны, вучацца лётаць і нават спрабуюць наплакаць лужыну. Праўда, адзін з іх увесь час марыць захварэць, а іншы ад душы паплакаць, але за вясёлымі прыгодамі ў іх не застаецца чакай ні на тое, ні на іншае.

**Намінацыя**
**«Лепшы твор літаратурнай крытыкі і літаратуразнаўства —**
**Аліны Сабуць**
**за кнігу «Літаратурныя дыялогі: мастацкія пошукі беларускай літаратуры ХХ-ХХІ стагоддзяў»**






**Сабуць, А. Э. Літаратурныя дыялогі: мастацкія пошукі беларускай літаратуры ХХ— ХХІ стагоддзяў** / Аліна Сабуць. — Мінск : Выдавецкі цэнтр Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, 2022. — 335 с.

У літаратуразнаўчым выданні на прыкладзе творчасці беларускіх класікаў, у тым ліку рэгіянальных пісьменнікаў даследуюцца нацыянальная самабытнасць айчыннай літаратуры, грамадскакультурны кантэкст, кантактныя сувязі беларускай літаратуры са славянскай і сусветнай літаратурай. На факталагічным літаратурна-мастацкім і навукова-тэарэтычным матэрыяле разглядаюцца пытанні нашаніўскага дыскурсу, рэцэпцыі беларускай літаратуры ў свеце, мастацкага перакладу і міжкультурнай камунікацыі, дзіцячай літаратуры, паэзіі, прозы і літаратуразнаўства.

# Намінацыя «Лепшы твор публіцыстыкі» — Макараў Уладзімір за кнігу «Во имя будущего страны. О приоритетах национальной безопасности в новом веке»






**Макаров, В. М. Во имя будущего страны** : о приоритетах национальной безопасности в новом веке / В. М. Макаров. — Минск : Колорград, 2022. — 428, [1] с.

У новым выданні прадоўжана тэма сацыяльнай рэвалюцыі і вайны ў кантэксце нацыянальнай бяспекі. Значная ўвага надаецца проціборству ў сферы сучасных камунікацый і падкрэсліваецца важнасць сацыяльна-гуманітарных ведаў у фарміраванні светапогляду грамадзян.